УДК 78.085.22

# ПОЛЬКА ДАСТОЕЎСКАЯ. ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ І УСПРЫМАННЯ МЕТАДАМ ДЭМАНСТРАТЫЎНАЙ АНТРАПАТЭХНІКІ

**В.Ю. Лесюк, Ф.І. Рацык**
**ДУА "Дастоеўская сярэдняя школа імя Ф. М. Дастаеўскага"**

У мэтах кансалідацыі беларускага народа, умацавання ў грамадстве ідэй міру і стваральнай працы як галоўных умоў развіцця беларускай дзяржавы Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 2023 год аб'яўлены годам міру і стварэння. Усё ў прыродзе падвяргаецца згубнаму ўплыву часу: дрэва, металы, нават нязломная, здавалася б, каменная цвярдыня. Але існуе такая ўнікальная субстанцыя, як памяць. Пільна аберагаемая яе носьбітамі, няўхільна перадаваемая з пакалення ў пакаленне, яна можа перажыць стагоддзі, тысячагоддзі, уваскрашаючы глыбінную гісторыю, адраджаючы старажытныя абрады і традыцыі, старадаўнія рамёствы, аднаўляючы з руін забыцця разбураныя архітэктурныя збудаванні.

Заходняе Палессе – адзін з рэгіёнаў Беларусі, дзе «жывая фальклорная памяць» народа жыве дагэтуль; а скарбы народнай культуры (звычаі, абрады, спевы, танцы, інструментальнае выканальніцтва) перадаюцца паміж пакаленнямі вусным шляхам (з голаса на голас, з нагі на нагу, з рукі на руку), без пісьмовай фіксацыі і развучвання па пісьмовых (акадэмізаваных, апрацаваных чужымі і часам вельмі далёкімі ад сапраўднай традыцыі спецыялістамі) крыніцах.

Мэта даследавання: выяўленне актуальных праблем пераймання і захавання скрыпічнага найгрыша да заходнепалескага традыцыйнага танца «Полька Дастоеўская» ў сучасным грамадстве.

Мэта дасягаецца вырашэннем наступных задач:

- апісаць паходжанне і адлюстраванне ў навуковых даследаваннях скрыпічнага найгрыша «Полька Дастоеўская» з рэпертуару Капэлы в. Ляхавічы Іванаўскага раена;
- выявіць асаблівасці праяўлення традыцыі скрыпічных найгрышаў да побытавых танцаў у наш час;
- вызначыць магчымыя шляхі пераймання скрыпічных найгрышаў да побытавых танцаў метадам дэманстратыўнай антрапатэхнікі.

Аб'ект даследавання: скрыпічныя найгрышы да заходнепалескіх побытавых танцаў з рэпертуару інструментальнай Капэлы в. Ляхавічы Іванаўскага раена.

Прадмет даследавання: праблема захавання і пераймання скрыпічнага найгрыша «Полька Дастоеўская» ў сучасным грамадстве метадамі, якімі найгрыш і танец зберагліі носьбіты традыцыі.

Музыкі з Іванаўскага раёна неаднаразова прыцягвалі ўвагу даследчыкаў і папулярызатараў традыцыйнага мастацтва. Дзякуючы намаганням вядомага беларускага этнахарэографа Мікалая Аляксеевіча Козенкі ўдалося больш поўна зафіксаваць для гісторыі на магнітафонную ленту ігру ляхавіцкіх музыкаў. Некалькі запісаў з гэтай экспедыцыі трапілі у выданне Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1. – Мінск, 2008. У ім можна

знайсці і паслухаць на кампакт-дыску запіс самой “Полькі Дастоеўскай” і “таксама” нотныя расшыфроўкі некаторых найгрышаў, якія запісаў М. А. Козенка.

У 2018 годзе ў офісе РМГА “Студэнцкае этнаграфічнае таварыства” адбылася прэзентацыя электроннага выдання “Апошні бас”. Наведнікаў пад час імпрэзы чакала дэманстрацыя ўнікальных аўдыязапісаў капэлы з басам, з архіва прафесара Іны Назінай і Мікалая Аляксеевіча Козенкі, эксклюзіўны прагляд фрагмента фільму “Старыя вясковыя музыкі” (1988 г.), выстава фотаздымкаў з сямейных архіваў ляхавіцкіх музыкаў і прэзентацыя альбома запісаў Капэлі з Ляхавіч скрыпача Віктара Прыбышчука Важнай часткай імпрэзы стала жывое гучанне і выкананне сучаснымі выканаўцамі скрыповай музыкі наігрышаў “Полька-Галоп” і “Латышка” [1].

Віктар Калістратавіч Прыбышчук (1902–1993), па-мясцоваму “Вітё”, “дід Вітё”, нарадзіўся ў вёсцы Ляхавічы, Кобрынскага павету Гродзенскай губерні. Мужчыны ў ягонай сям’і ўмелі граць і майстраваць смыковыя інструменты. У сямейнай капэле малы “Вітё” падбіваў на “барабане” (бубне), пасля перасеў за басэтлю, на скрыпцы пачаў граць у 10 год. У дваццацігадовым узросце стаў рабіць інструменты самастойна, зрабіў уласную басэтлю, на якой пасля басавалі без перапынку амаль 70 гадоў.

У выніку – скрыпак Прыбышчук, найстарэйшы з апошняга складу капэлы і яе фактычны кіраўнік, пакідае для нашчадкаў свой багаты меладычны запас, які каранямі сягае самага пачатку мінулага стагоддзя, вядзе радавод ад колішняга грання разам з бацькам-музыкам.

Надзвычай падрабязнае і акуратнае, як для вясковага музыкі-самавука, іменаванне полечна-вальсавых найгрышаў – полькі Агоўская (“Огово”), Дастоеўская (“Достоево”), Ляхавіцкая (“Ляховічы”) і Сушанская (“Сухэе”), вальс Бараўскі (“Боровая”), вальс Бродніцкі (“Бродніца”). Гэткімі назвамі, што нададзеныя самім выканаўцам з Гараваты, уганараваныя суседнія вёскі.

Каштоўны здабытак запісаў Ляхавіцкай Капэлі можна паслухаць дзякуючы сучасным інтэрнэт тэхналогіям. Запісы для праслухоўвання размешчаны[2] на платформе https://soundcloud.com па запыце “Прыбышчук”

Куратар праекта “Апошні бас” Аляксей Крукоўскі перадаў нам запіс з архіву І. Дз. Назінай, ў якім апытваюцца Віктар Прыбышчук і Мікалай Лукашэвіч. Пад час пошуку інфармацыі аб Ляхавіцкай капэлі нам удалося пазнаеміцца з дачкой аднаго з удзельнікаў гурта Мікалая Міронавіча Лукашэвіча Марыяй

Наша даследаванне разглядае скрыпку як універсальны інструмент для навучання і пераймання традыцыйнай музыкі метадам дэманстратыўнай антрапатэхнікі. Антрапатэхніка (утворана ад грэчаскіх слоў: Антропνθρώπος — чалавек; τέχνη — мастацтва, майстэрства, уменне) [3]. Такі складаны тэрмін можна абагуліць для простага чалавека, як “паўтары за мной”. Адна з прычынаў, чаму скрыпка ўжывалася для грання архаічных твораў — яе шырокія магчымасці. На ёй можна сыграць тыя народныя песні, якія не атрымаецца сыграць на гармоніках ці дудзе.

Музычную фальклорную спадчыну трэба пачынаць вяртаць праз дзіцячыя калектывы. А ўсё з-за таго, што амаль не знайсці тых людзей, якія валодаюць інструментамі, на якіх акампанавалі для гэтых танцаў у даўніну. У той перыяд,калі яны пераймаюць ад дарослых, бацькоў — носьбітаў сваёй рэгіянальнай культуры — мясцовыя танцы, спевы, музыку, павінна ісці і навучанне ігры на гэтых старажытных беларускіх інструментах. Але мала проста навучыць іграць на тым ці іншым інструменце, да разумення і жадання займацца традыцыйнай культурай трэба яшчэ духоўна дарасці. Калі ж знаёмства з фальклорам адбываецца ў дзяцінстве, дык закладваецца ўстойлівая этнічная аснова, няхай нават потым чалавек і не будзе займацца мастацтвам, творчасцю[3]. А фальклор, між тым, - невычэрпная крыніца для самарэалізацыі і выхавання асобы.

Па выніках даследавання можна зрабіць наступныя высновы.

1. Сярод актуальных праблем пераймання і захавання скрыпічнага найгрыша да заходнепалескага традыцыйнага танца «Полька Дастоеўская» ў сучаснасці можна акрэсліць адсутнасць носьбітаў традыцыйнай культуры, ад якіх можна натуральна пераняць найгрыш (пры ўсёй цікаўнасці да яго), што вымушае пераемнікаў засяродзіцца на вывучэнні навуковых крыніц і эксперыментальных метадах пераймання.

2. Скрыпічны найгрыш «Полька Дастоеўская» з рэпертуару Капэлы в. Ляхавічы Іванаўскага раена мае аўтахтоннае мясцовае паходжанне і адлюстраванне ў навуковых даследаваннях І.Назінай, М.Козенкі і іншых спецыялістаў у галіне фальклору Беларусі.

3. Дзякуючы фальклорнаму руху Усходняй Еўропы традыцыі скрыпічных найгрышаў да побытавых танцаў у наш час сталі запатрабаванымі і папулярнымі ў асяродку адукаваных і зацікаўленых мастацтвам жыхароў Беларусі.

4. Магчымыя сёння шляхі пераймання скрыпічных найгрышаў да побытавых танцаў метадам дэманстратыўнай антрапатэхнікі (у тым ліку і найгрыша «Полька Дастоеўская») павінны апеліраваць да вывучэння аўдыя- і відэязапісаў з архіваў спецыялістаў, што, пры правільным падыходзе і падтрымцы дзяржаўных устаноў здольна даць плённы вынік (нават да поўнага аднаўлення інструментальнай капэлы выканаўцаў найгрыша «Полька Дастоеўская») у будучым.

## Спіс літаратуры

1. Віктар Прыбышчук: скрыповыя найгрышы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://set.ethno.by/?p=6249. – Дата доступу: 01.02.2023.

2. Віктар Прыбышчук: скрыповыя найгрышы (з архіва Міколы Козенкі, 1984, в. Гаравата, Іванаўскі раён) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://soundcloud.com/ethnoby/sets/viktar-prybyszczuk. – Дата доступу: 01.02.2023.

3. Газета Культура. Экзатычная даўніна, альбо Калі ў вёсках загучаць гуслі і варган? [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.kimpress.by/index.phtml?page=2&id=944. – Дата доступу: 01.02.2023.